# *Адам Глобус*

Уладзімір Вячаслававіч Адамчык

# Біяграфія

**Нарадзіўся ў сям'і пісьменніка В. Адамчыка. З 1959 жыве Мінску. Скончыў педагагічнае аддзяленне Мінскага мастацкага вучылішча (1977), Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі ўніверсітэт (1983). Вучыўся ў мастака Альгерда Малішэўскага[1]. Працаваў чарцёжнікам, мастаком-рэстаўратарам, мастаком-афарміцелем, рэдактарам у часопісе «Родник» (з 1987). Цяпер займаецца выдавецкай дзейнасцю (выдавецтва «Сучасны літаратар»). Удзельнік Таварыства «Тутэйшыя» (1986—1990). Член Саюза пісьменнікаў СССР (з 1988), СП БССР (з 1989)**



Першыя вершы Адама Глобуса з’явіліся ў друку ў 1981 (газета «Літаратура і мастацтва», часопіс "Маладосць"). На дадзены ж момант ён аўтар больш, чым 20 кніг прозы і паэзіі, сярод якіх "Парк" (1988), "Адзінота на стадыёне" (1989), "Смерць — мужчына" (1992), "Скрыжаванне" (1993), "Дамавікамерон" (1994), "Толькі не гавары маёй маме" (1995), "Койданава" (1997), "Новы дамавікамерон" (1998), "Post scriptum" (1999), "Тэксты" (2000), "Браслаўская стыгмата" (2001), "Сшыткі" (2003), "Дом" (2005), "сУчаснікі" (2006), "Казкі" (2007). Яго творы перакладаліся на асноўныя мовы свету, а таксама на такія экзатычныя, як асецінская і каталонская. Асобнымі выданнямі проза А. Глобуса выходзіла ў Польшчы і Расіі.





*1988.- 94с.- (Першая кніга паэта)*
*Кніга “Парк” выдадзеная ў 1988г. дзякуючы падтрымцы Міхася Стральцова. Ён напісаў да яе прадмову “Слова і абрыс”. Вершы “Парка” – гэта так званая паэзія прысутнасці: рэчы і з’явы, апісаныя ў ёй, вылучаюцца пластычнасцю і колерам, набываюць новую бачнасць. Вершы Глобуса нагадваюць графічныя малюнкі. Для іх характэрна ўвага да дэталі, імкненне вылучыць канструктыўны абрыс.*


Адам Глобус
Парк





## *Глёбус, А. Толькі не гавары маёй маме…: зборнік інтымнай прозы .*

***У аповесцях кнігі “Толькі не гавары маёй маме”(1995) выпады супраць Сістэмы, на часы якой прыпалі яго дзяцінства і маладосць.***




